УДК 94(476)

**І. А. Андарала**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ПЕРАДУМОВЫ СТАНАЎЛЕННЯ ВЫШЭЙШАЙ ЗАВОЧНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ І ЯЕ РАЗВІЦЦЯ Ў БЕЛАРУСІ

У агульнай структуры нацыянальнай сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі істотнае месца займала і займае завочная падрыхтоўка педагагічных кадраў. Завочная і дзенная формы падрыхтоўкі настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй маюць шмат агульнага, і перш за ўсё гэта мэта і змест адукацыі. У той жа час завочнай педагагічнай адукацыі ўласціва і спецыфіка, якая знаходзіць сваё выражэнне ў арганізацыі і методыцы вучэбнага працэсу. За дзевяноста гадоў функцыянавання ў завочнай педагагічнай адукацыі рэспублікі адбыліся значныя змены як у колькасных, так і ў якасных характарыстыках. Істотнае значэнне для разумення і вырашэння існуючых праблем, вызначэння шляхоў далейшага развіцця завочнай падрыхтоўкі настаўнікаў мае вывучэнне адпаведнага гістарычнага вопыту яе станаўлення і развіцця. На жаль, гісторыя вышэйшай завочнай педагагічнай школы Беларусі пакуль што ўсебакова і грунтоўна не даследавана. У дадзеным артыкуле аўтар на аснове вывучэння архіўных крыніц, пераважна раней не апублікаваных, у рэчышчы комплекснага падыходу аналізуе перадумовы станаўлення і развіцця ў рэспубліцы вышэйшай завочнай педагагічнай адукацыі.

**Ключавыя словы:** адукацыя, школа, педагагічныя кадры, вышэйшая завочная педагагічная адукацыя.

**Для цитирования:** Андарала І. А. Перадумовы станаўлення вышэйшай завочнай педагагічнай адукацыі і яе развіцця ў Беларусі // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2021. № 2 (251). С. 20–23.

**I. A. Andarala**
Belarusian State Technological University

# PREREQUISITES FOR ESTABLISHING HIGHER CORRESPONDENCE PEDAGOGICAL EDUCATION AND ITS DEVELOPMENT IN BELARUS

In the general structure of the national system of higher pedagogical education a significant place was and is occupied by correspondence training of pedagogical staff. Part-time and full-time forms of teacher training with higher education have much in common and above all it is the purpose and content of education. At the same time, distance pedagogical education is characterized by specificity, which is expressed in the organization and methodology of the educational process. During the ninety years of functioning in the distance pedagogical education of the republic there have been significant changes in both quantitative and qualitative characteristics. It is essential to understand and solve existing problems, determine ways to further develop distance learning teachers is to study the relevant historical experience of its formation and development. Unfortunately, the history of the higher correspondence pedagogical school of Belarus has not been thoroughly and thoroughly researched yet. In this article, the author analyzes the preconditions for the formation and development of higher distance pedagogical education in the republic on the basis of a study of archival sources, mostly previously unpublished.

**Key words:** education, school, education, school, pedagogical staff, higher part-time pedagogical education.

**For citation:** Andarala I. A. Prerequisites for establishing higher correspondence pedagogical education and its development in Belarus. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2021, no. 2 (251), pp. 20–23 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Ва ўмовах структурных і змястоўных змен, якія адбываюцца ў школьнай адукацыі нашай краіны, істотна ўзрастаюць патрабаванні да сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў у цэлым і завочнай у прыватнасці. На сучасным этапе рэалізацыі Канцэпцыі развіцця педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь роля завочнай падрыхтоўкі настаўнікаў не толькі не змяншаецца, а наадварот, набывае ўсё большую значнасць, выступаючы як падсістэма бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Сёння вышэйшая завочная педагагічная адукацыя – гэта не толькі прафесійная адукацыя, але і павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў, якія скончылі педагагічныя каледжы і ўжо працуюць у агульнаадукацыйных школах.

Завочную падрыхтоўку педагагічных кадраў у рэспубліцы ажыццяўляюць 4 профільныя і 9 класічных універсітэтаў. Фактычна кожныя двое з пяці будучых настаўнікаў вышэйшай кваліфікацыі з'яўляюцца студэнтамі-завочнікамі.

На жаль, працэс станаўлення і развіцця завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі ў Беларусі не атрымаў свайго ўсебаковага асвятлення ў айчыннай навуковай літаратуры.

**Асноўная частка.** Хуткае развіццё школьнай адукацыі, якое адбывалася ў Беларусі пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі, выключна абвастрыла праблему адсутнасці неабходнай колькасці кваліфікаваных педагагічных кадраў для школ рэспублікі. Каб вырашыць яе, савецкімі ўладамі ў 1918 г. было прынята рашэнне аб рэарганізацыі Віцебскага настаўніцкага інстытута ў педагагічны інстытут, а ў 1919 г. – аб ператварэнні яго ў інстытут народнай адукацыі. У тым жа 1919 г. былі створаны два новыя інстытуты народнай адукацыі – у Магілёве і Гомелі. У 1920 г. да іх далучыўся інстытут народнай адукацыі, які пачаў функцыянаваць у Мінску. Такім чынам, у рэспубліцы быў пакладзены пачатак станаўлення і развіцця сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі.

Новы этап у развіцці вышэйшай педгагічнай адукацыі, як і ўсёй сістэмы народнай адукацыі Беларусі, быў звязаны з выкананнем Закона «Аб усеагульным абавязковым пачатковым навучанні», які быў прыняты ЦВК і СНК СССР у жніўні 1930 г.

Да 1930 г. педагагічныя кадры з вышэйшай адукацыяй у рэспубліцы рыхтаваў толькі педагагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Штогод дыпломы настаўнікаў матэматыкі, мовы, літаратуры, фізікі, хіміі, біялогіі, гісторыі, геаграфіі атрымлівалі крыху больш за 300 выпускнікоў. Як правіла, яны накіроўваліся для педагагічнай працы ў тэхнікумы і рабфакі. У масавай школе выпускнікі БДУ практычна не працавалі.

Адсутнасць у рэспубліцы вышэйшых педагагічных вучэбных устаноў адмоўна сказвалася на якасным складзе педагагічных кадраў агульнаадукацыйных школ і стрымлівала развіццё школьнай адукацыі.

Каб забяспечыць масавую школу кваліфікаванымі настаўнікамі, было прынята рашэнне аб адкрыцці ў рэспубліцы з 1 верасня 1930 г. трох інстытутаў з двухгадовым тэрмінам навучання. У Віцебску аднавіў дзейнасць індустрыяльна-педагагічны інстытут, у Гомелі і Магілёве былі створаны аграрна-педагагічныя інстытуты. У 1931 г. падрыхтоўку педагагічных кадраў пачаў ажыццяўляць Мінскі вышэйшы педагагічны інстытут, створаны на базе педагагічнага факультэта БДУ.

Аднак, нягледзячы на дзейнасць БДУ і чатырох педагагічных інстытутаў, вырашыць праблему падрыхтоўкі неабходнай колькасці кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў для агульнаадукацыйнай школы праз дзённую форму навучання было немагчыма.

Такім чынам, эканамічныя і сацыякультурныя абставіны, якія склаліся ў рэспубліцы ў пачатку трыццатых гадоў, абумовілі супярэчнасць паміж вострай патрэбай школ рэспублікі ў значнай колькасці кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў і немагчымасцю забяспечыць іх падрыхтоўку ў рамках існаваўшай у той час у Беларусі сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі. У вырашэнні дадзенай супярэчнасці, як паказала практыка РСФСР, істотную ролю магла і павінна была аказаць завочная форма падрыхтоўкі педагагічных кадраў.

Гісторыя завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі ў Беларусі бярэ свой пачатак з 21 лютага 1932 г., калі ў адпаведнасці з пастановай СНК БССР ад 23 мая 1931 г. «Аб сістэме завочнага навучання» [1, с. 3] Народным Камісарыятам асветы рэспублікі было зацверджана «Палажэнне аб завочных сектарах пры ВНУ, педтэхнікумах, рабфаках сістэмы Наркамасветы» [1, с. 5].

Згодна з палажэннем, перад БДУ і ўсімі вышэйшымі педагагічнымі ўстановамі рэспублікі была пастаўлена задача па стварэнні завочных сектараў, якія павінны былі забяспечыць спецыяльную, метадычную падрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў, якія працавалі ў школе, але не мелі педагагічнай адукацыі.

Улічваючы ўсю складанасць арганізацыйнага перыяду па стварэнні завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі, Калегія Народнага Камісарыята асветы БССР 15 сакавіка 1932 г. прыняла пастанову «Аб правах і ільготах для студэнтаў-завочнікаў». Асноўная мэта пастановы заключалася ў стымуляванні жадання ў працуючых без адпаведнай адукацыі настаўнікаў атрымліваць вышэйшую педагагічную адукацыю на завочных сектарах педагагічных інстытутаў [1, с. 11].

У адпаведнасці з прынятай пастановай, выпускнікі-завочнікі, поўнасцю выканаўшыя вучэбны план завочнага сектара, прыраўноўваліся ў сваіх правах да выпускнікоў, якія скончылі стацыянарныя аддзяленні інстытутаў.

Арганізацыйнаму станаўленню сістэмы завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі таксама садзейнічала прынятае 9 мая 1932 г. пастанова СНК БССР № 243 «Аб дадатковым водпуску студэнтам-завочнікам» [1, с. 12]. Згодна з вышэйназванай пастановай, дырэктары школ абавязаны былі даваць студэнтам-завочнікам на перыяд сесіі дадатковы водпуск працягласцю да 12 працоўных дзён з захаваннем заработнай платы.

Першым у 1932 г. пачаў функцыянаваць завочны сектар Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута. У 1932/33 вучэбным годзе агульная колькасць студэнтаў завочнага сектара інстытута склала 757 чалавек (сацыяльна-эканамічны факультэт – 267, літаратурна-лінгвістычны – 302 і педолага-педагагічны – 188) [2, с. 50].

БССР адной з першых сярод саюзных рэспублік завяршыла пераход на ўсеагульнае пачатковае навучанне. Гэта дазволіла СНК БССР прыняць 2 жніўня 1932 г. пастанову, якая абавязвала «ўвесці з 1932/33 вучэбнага года ўсеагульнае абавязковае навучанне ў аб'ёме сямігадовай школы для ўсіх дзяцей, якія завяршаюць першы канцэнтр (4 групу), а таксама дзяцей, якія ў цяперашні час навучаюцца ў старшым канцэнтры сямігадовай школы» [3, с. 137–138].

У лістападзе гэтага ж года IV пленум ЦК КП(б) Беларусі абмеркаваў пытанне аб рэарганізацыі сеткі школ, адзначыў нездавальняючыя тэмпы па развіцці сямігадовых школ, асабліва ў сельскай мясцовасці, і запатрабаваў актывізаваць гэты працэс. Наркамасветы і Дзяржплану БССР было даручана з мэтай падрыхтоўкі кантынгенту для ВНУ распрацаваць план рэарганізацыі сямігадовых школ у сярэднія (у першаю чаргу ў прамысловых цэнтрах і буйных сельскіх населеных пунктах).

Ва ўмовах пашырэння сеткі сямігадовых школ, а пачынаючы з 1932/33 вучэбнага года і сярэдніх школ, праблема падрыхтоўкі настаўнікаў з вышэйшай педагагічнай адукацыяй значна абвастрылася. Адной з мер па вырашэнні гэтай праблемы стала ператварэнне ў 1933 г. Віцебскага індустрыяльна-педагагічнага інстытута, Гомельскага і Магілёўскага аграрна-педагагічных інстытутаў у педагагічныя інстытуты з 4-гадовым тэрмінам навучання.

Пачынаючы з 1933/34 вучэбнага года завочныя сектары сталі функцыянаваць пры дванаццаці факультэтах усіх чатырох педагагічных інстытутаў і Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Як сведчаць архіўныя матэрыялы, у першыя гады свайго функцыянавання завочныя сектары педагагічных інстытутаў адчувалі значныя складанасці: практычна адсутнічалі вучэбныя праграмы, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў-завочнікаў, адчуваўся востры дэфіцыт вучэбных плошчаў у час залікова-лабараторных сесій, не хапала штатных выкладчыкаў.

Трэба адзначыць, што нягледзячы на прынятыя СНК БССР і Наркамасветы рэспублікі пастановы, меўшыя сваёй мэтай стымуляваць жаданне настаўнікаў атрымаць адпаведную адукацыю без адрыву ад педагагічнай працы ў школе, тлумачальную і агітацыйную дзейнасць педагагічных інстытутаў, аддзелаў адукацыі на месцах, станаўленне завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі ў рэспубліцы праходзіла выключна складана і марудна. Пацверджаннем гэтаму з'яўляецца той факт, што планы выпуску дыпламаваных спецыялістаў завочнымі сектарамі педагагічных інстытутаў штогод не выконваліся. Так, завочным сектарам пры Мінскім вышэйшым педагагічным інстытуце з 1932 г. (год стварэння) і да 1937 г. уключна было прынята 2472 чалавекі, а выпушчаны за гэты час з дыпломам настаўніка толькі 141 чалавек [4, с. 87].

СНК БССР і ЦК КП(б)Б, разгледзеўшы 29 мая 1936 г. пытанне аб забеспячэнні школ рэспублікі педагагічнымі кадрамі, у сваёй пастанове «Аб мерапрыемствах па павышэнні адукацыі настаўнікаў» адзначылі, што «…завочнае навучанне настаўнікаў пастаўлена нездавальняюча» і абавязалі Наркамасветы ажыццявіць мерапрыемствы па ахопе абавязковай вучобай настаўнікаў, не меўшых адпаведнай педагагічнай адукацыі [3, с. 249].

Станаўленне вышэйшай завочнай педагагічнай адукацыі ў Беларусі ў 30-х гг. XX ст. з'яўлялася прамым адлюстраваннем сацыяльна-палітычных падзей, якія вызначалі дзяржаўную школьную палітыку ў рэспубліцы.

**Заключэнне.** Гісторыка-педагагічны аналіз працэсу станаўлення і развіцця завочнай формы падрыхтоўкі настаўнікаў у педагагічных інстытутах дае падставу заключыць, што яна была прыярытэтнай сферай у адукацыйнай палітыцы партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі. Аднак, як сведчаць матэрыялы архіўных дакументаў, станаўленне вышэйшай завочнай педагагічнай адукацыі адбывалася выключна марудна. Асноўнымі стрымліваючымі фактарамі, на нашу думку, былі: адсутнасць у значнай часткі працуючых настаўнікаў рэспублікі жадання завочна атрымліваць педагагічную спецыяльнасць; нездавальняючае вучэбна-метадычнае забеспячэнне студэнтаў у сесійны перыяд; недасканаласць форм і метадаў завочнага навучання, якія выкарыстоўваліся педагагічнымі інстытутамі ў пачатку 1930-х гг.

## Спіс літаратуры

1. Зборнік матэрыялаў па педагагічным завочным навучанні ў БССР. Мінск: Вучпедсектар ДВБ. Друк. імя Сталіна, 1932. 28 с.

2. Минский ордена Трудового Красного Знамени государственный педагогический институт им. А. М. Горького (1922–1972). Минск: Выш. шк., 1974. 349 с.

3. Народное образование в БССР: сб. док. и материалов: в 2 т. Т. 2. 1928–1941 гг. Минск: Нар. асвета, 1980. 462 с.

4. Дрозд Л. Н. Развитие средней общеобразовательной школы в Белоруссии 1917–1941. Минск: Нар. асвета, 1986. 160 с.

## References

1. *Zbornik materyyalau pa pedagagichnym zavochnym navuchanni u BSSR* [Collection of materials on pedagogical distance learning in the BSSR]. Minsk, Vuchpedsektar DVB. Druk. imya Stalina Publ., 1932. 28 p.
2. *Minskiy orden Trudovogo Krasnogo Znameni gosudarstvennyy pedagogicheskiy institut im. A. M. Gor'kogo (1922–1972)* [Minsk Order of the Red Banner of Labor State Pedagogical Institute named after A. M. Gorky (1922–1972)]. Minsk, Vysh. shk. Publ., 1974. 349 p.
3. *Narodnoe obrazovanie v BSSR: sb. dok. i materialov. T. 2. 1928–1941* [Public education in the BSSR. Vol. 2. 1928–1941]. Minsk, Nar. asveta. Publ., 1980. 462 p.
4. Drozd L. N. *Razvitiye sredney obshcheobrazovatel'noy shkoly v Belorussii 1917–1941* [Development of secondary general education school in Belarus 1917–1941]. Minsk, Nar. asveta Publ., 1986. 160 p.

## Інфармацыя пра аўтара

**Андарала Ігар Аляксандравіч** – кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: aia1106@mail.ru

## Information about the author

**Andarala Igar Alyaksandravich** – PhD (Pedagogics), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: aia1106@mail.ru

*Паступіў 10.09.2021*